№4 (209)
2007

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Сьпіс пашыраны

Злучаныя Штаты дадалі да сьпісу беларускіх чыноўнікаў, адказных за фальшаваньне леташніх прэзідэнцкіх выбараў і разгон акцыяў апазіцыі, яшчэ шэсьць чалавек. Гэта – генеральны пракурор Беларусі Пётр Міклашэвіч, начальнік палка міліцыі сьпецпрызначэньня Юры Падабед, міністры адукацыі і інфармацыі, адпаведна, Аляксандр Радзькоў і Уладзімір Русакевіч, былы міністр унутраных справаў Юры Сівакоў і начальнік упраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў міністэрства юстыцыі Алег Сьліжэўскі.

Такім чынам, колькасьць чыноўнікаў, якія патрапілі пад санкцыі ЗША, вырасла да 16-ці – 19 чэрвеня 2006 году прэзідэнт Джордж Буш падпісаў указ аб фінансавых санкцыях адносна 10 асобаў. Тады ў сьпіс патрапілі Аляксандр і Віктар Лукашэнкі, Натальля Пяткевіч, Віктар Галаванаў, Аляксандар Зімоўскі, Сьцяпан Сухарэнка, Віктар Шэйман, Дзьмітры Паўлічэнка, Уладзімір Навумаў і Лідзія Ярмошына.

## Мэта – абарона правоў чалавека

На паседжаньні Рады ЕС па пытаньнях юстыцыі і ўнутраных справаў 15 лютага прынятае рашэньне аб заснаваньні Агенцтва Еўрапейскага Саюзу па пытаньнях абароны асноўных правоў чалавека. Агенцтва заснаванае на базе Еўрапейскага маніторынгавага цэнтру па пытаньнях расізму і ксенафобіі са штаб-кватэрай у Вене.

Мэта Агенцтва – дапамога і экспэртная падтрымка па пытаньнях абароны асноватворных правоў чалавека. Агенцтва мае права падаваць свае заключэньні інстытутам і дзяржавам-сябрам ЕС аб сумяшчальнасьці нормаў або мераў, накіраваных на імплементацыю права ЕС, з прынцыпамі асноватворных правоў чалавека. У сваіх заключэньнях Агенцтва будзе кіравацца Хартыяй асноватворных правоў Еўрапейскага Саюзу. Акрамя таго, у функцыі Агенцтва ўваходзіць публікацыя агляду сітуацыі з захаваньнем асноватворных правоў у ЕС і ўзорных практыкаў у гэтай сферы.

Агенцтва пачне сваю працу 1 сакавіка 2007 году.



Фота byMedia.net

*На здымку: маладафронтаўцы Алег Корбан, Зьміцер Хведарук і Барыс Гарэцкі на прэс-канферэнцыі.*

# Ні за што...

***Канстанцін Лукашоў асуджаны на двухгадовае зьняволеньне з адтэрміноўкай выкананьня пакараньня на два гады.***

20 лютага, а 10 гадзіне раніцы судзьдзя Ленінскага райсуда Красоўская З.В. абвясьціла прысуд па крымінальнай справе Канстанціна Лукашова, брата апазіцыянера Вячаслава Сіўчыка. Некалькі дзясяткаў людзей прыйшлі падтрымаць нявіннага чалавека, сярод іх – родныя, сябры, прадстаўнікі грамадзкасьці, праваабаронцы, журналісты.

Канстанцін Лукашоў прызнаны вінаватым ва ўчыненьні злачынства па арт. 364 КК РБ – гвалт альбо пагроза прымяненьня гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі і пакараны двума гадамі пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай на два гады. Таксама сп. Лукашоў павінен сплаціць міліцыянту Сушчэню 1 мільён беларускіх рублёў маральнай кампенсацыі і аплаціць дзяржпошліну і судовыя затраты.

Вынесенае пакараньне для ПЦ “Вясна” пракаментаваў Вячаслаў Сіўчык: “На вялікі жаль, Ленінскі суд прадэманстраваў, што незалежнага суда ў Беларусі аб’ектыўна існаваць ня можа, таму што пры аўтарытарным рэжыме падзелу ўлады проста не існуе. Натуральна, я задаволены, што ні ў чым не вінаваты чалавек – мой брат – сёньня выйшаў на волю, але я лічу, што вельмі небясьпечна для беларускага грамадзтва, калі так груба парушаецца права, калі так груба ігнаруюцца беларускія законы”.

Сам Канстанцін Лукашоў адразу пасьля арышту меў надзею, што справу закрыюць альбо пакараньне будзе мінімальным:

– Спачатку было адчуваньне, што мяне як незаконна затрымалі, так павінны былі і ціха адпусьціць. Калі б не было рэзанансу, напэўна, так і зрабілі б: патрымалі б недзе да выбараў у мясцовыя Саветы, а пасьля іх і выпусьцілі. Можа быць... Я хачу падзякаваць праваабаронцам і ўсім грамадзянам, якія падтрымалі мяне, бо гэта, дарэчы, асноўнае. І вельмі добра, што ў нас ёсьць такія арганізацыі і людзі, якія не кідаюць чалавека ў складаны час, я адчуваў падтрымку з усіх бакоў: і ад сваякоў, і ад сваіх

*(Працяг на стар. 2)*

## Рэпрэсіі працягваюцца

***Крымінальная справа ў дачыненьні да моладзевага актывіста Зьмітра Хведарука перададзеная ў пракуратуру.***

Зьміцер Хведарук, які разам з маладафронтаўцам Алегам Корбанам зьяўляецца падазраваным па крымінальнай справе, узбуджанай 4 лютага па арт.193.1 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), атрымаў афіцыйнае паведамленьне аб тым, што крымінальная справа была перададзеная ў пракуратуру. Афіцыйны ліст быў падпісаны капітанам КДБ, спадаром Сьвістуном, які практычна і кіруе працэсам па арганізацыі рэпрэсіяў у дачыненьні да беларускае моладзі і выкананьнем загадаў вышэйшага кіраўніцтва, паведаміла прэс-служба МФ і нагадала, што менавіта гэты супрацоўнік КДБ кіраваў незаконнымі дзеяньнямі байцоў ПМСС і прадстаўнікоў камітэту бясьпекі падчас затрыманьня 27-мі рэгіянальных і менскіх лідэраў Маладога Фронту 4 лютага на паседжаньні Цэнтральнае Рады моладзевага нацыянальнага руху.

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# Зьнялі з цягніка і ў СІЗА...

***Дзянісу Дзянісаву пагражае зьняволеньне тэрмінам на тры гады за "арганізацыю групавых дзеяньняў, груба парушаючых грамадзкі парадак"***

Моладзевага актывіста, удзельніка намётавага мястэчка ў Менску Дзяніса Дзянісава затрымалі 16 лютага ў Гомелі, адкуль ён меў намер выехаць у Віцебск. Больш за тыдзень яго ўтрымлівалі ў гомельскім сьледчым ізалятары. Летась супраць Дзяніса Дзянісава завялі крымінальную справу паводле абвінавачаньня ў "арганізацыі групавых дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак". Паводле гэтага артыкулу яму пагражае зьняволеньне да трох гадоў.

Дзяніс Дзянісаў стаў вядомым пасьля падзеяў на Кастрычніцкай плошчы ў Менску падчас леташніх выбараў прэзідэнта Беларусі. Менавіта ён з сябрамі пачаў ставіць намёты на плошчы, а пасьля адбыў за гэта 10-дзённы арышт на Акрэсьціна.

Пра магчымыя прычыны затрыманьня "Польскаму радыё" распавёў адзін з моладзевых актывістаў Алесь Мазур:

– Летам у Віцебску была праведзеная акцыя, па выніках якой улады ўзбудзілі крымінальную справу за быццам бы арганізаваныя дзеяньні групы асобаў, якія былі прычынаю масавых беспарадкаў. Тады па той справе праходзілі дзьве асобы, хаця арыштаваных было болей. Сярод іх і Тацяна Елавая, якая зьехала з Беларусі і вучыцца зараз у Вільні. Дзяніс застаўся ў Беларусі, хаця быў увесь гэты час у напаўлегальным становішчы. Такім чынам, хутчэй за ўсё, гэтае затрыманьне зьвязанае з той справай, бо нічога іншага яны не рабілі.

Вячаслаў Сіўчык не выключае таго, што, хутчэй за ўсё, падставай дзеля арышту сталі падзеі ў Віцебску летам 2006 году, калі на асьвятляльнай вежы гарадзкога стадыёну моладзевая актывістка Крысьціна Шацікава вывесіла бел-чырвона-белы сьцяг, а ў горадзе зьявіліся графіці "Бунт!".

Сяброўка Дзяніса Тацяна Дзядок кажа, што Дзянісу нават не дазваляюць перадаць ежу і цёплыя рэчы. Аднак пасьля затрыманьня Дзянісаў меў магчымасьць праз тэлефон паведаміць падрабязнасьці затрыманьня: "Ён сказаў, што яму прад'явілі пастанову, на падставе якой адбываецца арышт. У ёй быў пазначаны арт. 342 ч.1 КК РБ "Арганізацыя групавых дзеяньняў, груба парушаючых грамадзкі парадак". Там таксама было запісана, што ён павінен утрымлівацца пад вартай. Спачатку яго накіравалі ў лінейны аддзел у Гомелі. А пазьней перавезьлі ў СІЗА. Пакуль што ніякага абвінавачаньня яму не прад'явілі, гэта могуць зрабіць пасьля таго, як ён пройдзе па этапу. Яго павінны перавесьці ў Менск, а пазьней – у Віцебск. Афіцыйна кажуць, што дата этапу стане вядомай непасрэдна ў той дзень, калі яго і будуць этапаваць".

Да Дзяніса не пускаюць адваката. Адбыцца гэта зможа толькі пасьля таго, калі яго перавядуць у Віцебск.

Маці Дзянісава Раіса Аляксееўна неаднаразова тэлефанавала ў Гомельскі сьледчы ізалятар, але там ёй адмаўляліся паведаміць хаця б нейкія падрабязнасьці пра сына: "Яго павінны перавесьці 24 лютага, хаця ёсьць інфармацыя, што здарыцца гэта можа і 23 лютага. Пра абвінавачаньне нічога ня кажуць. Вядома, што перавесьці павінны ў СІЗА №2 у Віцебску. Я не разумею, чаму яго затрымалі, маглі проста ўзяць падпіску аб нявыезьдзе. Ён жа ніякага крыміналу не ўчыніў. Зьнялі з цягніка і ўсё".

Крымінальная справа супраць Дзяніса Дзянісава цягнецца паўгоду. Да гэтай пары на допытах па справе пабывала больш за 80 асобаў, неаднаразова адбываліся вобшукі ў кватэрах моладзевых актывістаў. За парушэньне артыкулу 342 КК РБ, які пакуль інкрымінуецца Дзянісаву, пагражае да 3 гадоў пазбаўленьня волі.

27 лютага стала вядома, што Дзяніса Дзянісава перавезьлі ў віцебскі сьледчы ізалятар №2. Гэта пацьвердзіў дзяжурны сьледчага ізалятару. 27 лютага маці актывіста Раіса Дзянісава перадала сыну перадачу: харчы і цёплае адзеньне. Сустракацца з сынам ёй не дазваляюць. Паводле Раісы Дзянісавай, 28 лютага да Дзяніса пойдзе адвакат, ад якога яна спадзяецца даведацца пра вылучанае абвінавачаньне.

Раіса Дзянісава распавяла Радыё Свабода, як спрабавала сустрэць сына на віцебскім вакзале: "Калі прывязуць, было невядома. Бегала па вакзале, сустракала цягнікі. Ведаеце, як сэрца маці непакоіцца… Але нічога. У нядзелю пайшла ў ізалятар, хацела перадачу перадаць, але ў нядзелю і панядзелак перадачаў не прымаюць, таму нічога не казалі. Толькі сёньня прынялі перадачу".

Між тым сваякі Дзянісава не выключаюць, што артыкул абвінавачаньня зьменяць, бо ягоную справу перадалі іншаму сьледчаму.

**Інфармацыйны аддзел ПЦ "Вясна".**

## Свабоду палітвязьням! Свабоду Дзянісаву!

**Грамадзкія актывісты патрабуюць неадкладна вызваліць удзельніка намётавага мястэчка, арганізаванага ў сакавіку 2006 году на Кастрычніцкай плошчы Менску, Дзяніса Дзянісава. Вячаслаў Сіўчык перадаў ПЦ "Вясна" зварот за подпісам былога дэпутату Бабруйскага гарсавету, звольненага настаўніка Алеся Чыгіра, былога каменданта намётавага мястэчка Алеся Мазура і самога спадара Сіўчыка. Падаем тэкст звароту:**

**"16 лютага 2007 году быў арыштаваны актыўны ўдзельнік абароны намётавага мястэчка Плошчы Каліноўскага Дзяніс Дзянісаў.**

**Мы разглядаем арышт Дзянісава як звядзеньне рахункаў антынароднага рэжыму за спробу данесьці людзям ідэалы дэмакратыі, вяршынства права і павагу да правоў чалавека.**

**Лічым "справу" Дзянісава цалкам палітычнай і патрабуем яго неадкладнага вызваленьня.**

**Мы абураныя дзеяньнямі ўлады, якая лічыць, што зьяўленьне чарговага палітзьняволенага ёсьць адэкватным адказам на Эўрапейскія прапановы.**

**Заклікаем палітычныя партыі, грамадзкія арганізацыі і ўсіх людзей добрай волі патрабаваць неадкладнага вызваленьня Дзяніса Дзянісава.**

**Свабоду палітвязьням! Свабоду Дзянісаву! Свабоду не спыніць!"**

# Ні за што...

*(Пачатак на стар. 1)*

сяброў, – ад многіх людзей, і мне яна была вельмі патрэбная. Калі казаць пра прысуд, то ў судзьдзі не было іншага выйсьця, таму я яе па-чалавечы разумею... Але адказваць за ўсё гэта давядзецца, бо калі выносяць прысуд па тэлефоннаму праву, то гэта нікуды ня варта. Наконт абскарджваньня магу сказаць, што ў нашай краіне разьлічваць на нешта ня мае сэнсу, аднак усё роўна трэба прайсьці ўсе гэтыя працэдуры".

Актывіст незарэгістраванай ініцыятывы "Партнёрства" Цімафей Дранчук прысутнічаў на судовых паседжаньнях і лічыць справу Канстанціна Лукашова працягам той палітычнай крымінальнай кампаніі, якую даўно ўжо праводзяць улады Беларусі ў дачыненьні да грамадзкіх актывістаў: "Нельга, канешне, радавацца такому прысуду, улічваючы, што ён ні за што. Аднак я ўсё роўна рады, што Кастусь сёньня вызвалены, што ён здолее абняць сваіх родных, бо я сам нядаўна паспытаў гэтыя адчуваньні, калі пасьля дзесяці месяцаў нарэшце выйшаў на волю, хаця свой тэрмін таксама абсалютна ні за што адседзеў".

Нагадаем, што навуковы супрацоўнік Акадэміі навук Беларусі Канстанцін Лукашоў быў затрыманы на працоўным месцы 19 сьнежня ў той дзень, калі ягонай маці споўнілася 65 гадоў. Па словах сьледчага, падставай дзеля арышту паслужыла тое, што ён не зьяўляўся на допыты. Два месяцы сп. Лукашоў незаконна ўтрымліваўся ў СІЗА на вул. Валадарскага. Яму інкрымінаваўся наезд на аўтамабілі на супрацоўніка міліцыі 29 сакавіка 2006 году, калі ён забіраў свайго брата Вячаслава Сіўчыка з аддзяленьня хірургіі 3-й клінікі Менску. Невядомыя людзі ў цывільным знакамі загадалі Канстанціну спыніцца, але ён гэтага не зрабіў, пазьней высьветлілася, што гэта былі супрацоўнікі МУС. Праз нейкі час адзін з міліцыянтаў зьвярнуўся ў пракуратуру з заявай, што яго нібыта зьбіў аўтамабіль Лукашова, ён прадставіў заключэньне медэкспертызы, што атрымаў чэрапна-мазгавую траўму. Была ўзбуджаная крымінальная справа.

У судзе міліцыянт Анатоль Сушчэня прасіў спагнаць з Канстанціна два мільёны рублёў (каля тысячы даляраў ЗША) матэрыяльнай кампенсацыі за нібыта сапсаваную вопратку. Аднак падчас судовага разгляду сьведкі з боку абвінавачаньня зьмянілі свае сьведчаньні. Паводле іх першапачатковай версіі, сп.Лукашоў нібыта адштурхоўваў супрацоўніка міліцыі (праходзіць па справе ў якасьці пацярпелага) ад машыны. На паседжаньні гэтыя сьведкі заявілі, што першапачатковыя сьведчаньні, якія ёсьць у матэрыялах справы, былі няправільнымі, і фактаў якога-небудзь сілавога ўзьдзеяньня Канстанцінам Лукашовым на супрацоўнікаў міліцыі яны ня бачылі...

# Барыс ГАРЭЦКІ: “Мы ня будзем чакаць 2011 году!”

***Вясна ў Беларусі прыносіць з сабой ня толькі адлігу. Палітычнае супрацьстаяньне, якое выліваецца ў вулічныя акцыі пратэсту, традыцыйна суправаджае абуджэньне прыроды. Рухаючая сіла акцыяў – моладзь. Апошнія гады маладыя актыўныя беларусы вызначаюць характар змаганьня за свабоду. Пазіцыя моладзі зьяўляецца вызначальнай і ў стратэгічных развагах старэйшых палітыкаў.***

***“Зьмены ў грамадзтве, за якія змагаецца моладзь, непазьбежныя”, – лічыць мой суразмоўца Барыс ГАРЭЦКІ. Нашая сустрэча з ім адбылася вечарам 28 лютага. Так “за паўгадзіны да Вясны-2007” малады палітык адказаў на пытаньні, выказаў свае прагнозы і меркаваньні адмыслова для “Права на Волю”.***



Барыс ГАРЭЦКІ.

***– Днямі маладафронтаўцы зьвярнуліся ў КДБ і пракуратуру з патрабаваньнем вярнуць кампутары. Пры якіх абставінах была канфіскаваная гэтая тэхніка?***

– Мы патрабуем вярнуць кампутары і тэхніку, якая была канфіскаваная ў маладафронтаўцаў 4 лютага падчас захопу АМАПам Цэнтральнай Рады Маладога Фронту ў Менску. Гэтыя кампутары належаць актывістам МФ Аляксею Янушэўскаму, Настасьсі Палажанцы, Зьмітру Хведаруку, Яраславу Грышэні і Алегу Корбану. Таксама з гэткім жа патрабаваньнем да органаў зьвярнуўся я асабіста, – патрабую аддаць мой прыватны ноўтбук, які быў канфіскаваны 23 сьнежня мінулага году на беларускапольскай мяжы. Кампутар да гэтага часу афіцыйна знаходзіцца на Гарадзенскай мытні, але я больш чым упэўнены, што ён у Менску і праходзіць чарговую праверку. Да гэтага часу мэты і абставіны гэтай праверкі мне не паведамлялі. Зыходзячы з усіх гэтых фактаў, мы патрабуем неадкладна вярнуць нашую маёмасьць.

***– Апошнія падзеі сьведчаць, што Малады Фронт знаходзіцца пад пільнай увагай сьпецслужбаў. Ці адчуваецца ціск на арганізацыю?***

– Ціск адчуваецца на ўсіх узроўнях, – як на лідэраў, так і на шараговых сяброў. У школы прыходзяць супрацоўнікі КДБ і пачынаюць запалохваць 14-16 гадовых хлопцаў і дзяўчат. Такія выпадкі вядомыя і ня толькі ў Менску. Тым ня менш, пазіцыя маладафронтаўцаў застаецца ранейшай, – мы працягваем сваю дзейнасьць. Малады Фронт – гэта дэмакратычны моладзевы рух, які дзейнічае на прынцыпах законнасьці і адкрытасьці. Мы не хаваемся. Хаця, безумоўна, пэўныя захады па бясьпецы сваіх сяброў мы прымаем.

***– Першага сакавіка ўступіў у дзеяньне новы Адміністрацыйны кодэкс, у якім сярод іншых зьменаў прадугледжаная адказнасьць за правапарушэньні з 14 гадоў...***

– Таксама прадугледжаны арышт на 25 сутак... Цалкам магчыма, што гэта палітычныя захады, зробленыя дзеля таго, каб запалохаць дэмакратычных актывістаў. Новы Адміністрацыйны кодэкс, я мяркую, унясе ў палітычнае жыцьцё некаторыя зьмены. Але нам, маладафронтаўцам, баяцца адміністрацыйнага пакараньня не выпадае.

***– Пад пагрозай зьняволеньня зараз адзін з лідэраў Маладога Фронту – Зьміцер Хведарук. За кратамі амаль паўгоду знаходзіцца Зьміцер Дашкевіч. Ці даходзяць ад яго нейкія зьвесткі, што вам вядома пра ягоны стан?***

– У адносінах да Зьмітра Дашкевіча, як і да іншых маладафронтаўскіх палітвязьняў, кіраўніцтва калоніі ставіцца вельмі прадузята. Гэта і шматлікія вымовы, забароны перадачаў і сустрэчаў, штодзённы ўціск. Але, ня гледзячы на усё гэта, я ўпэўнены, што ўрэшце рэшт пад прэсінгам грамадзтва Лукашэнка будзе вымушаны выпусьціць на волю ўсіх палітвязьняў...

***– Напярэдадні 25 сакавіка ўсе гавораць, што моладзь зьяўляецца асноўнай рухальнай сілай пераменаў. Моладзі баяцца, на яе спадзяюцца. Моладзь чакаюць гэтай вясной.***

– Вясной-2007 моладзевыя акцыі пратэсту будуць працягвацца. Пасьля “Плошчы” мы бачым вынік, – вельмі вялікая частка маладых беларусаў выступаюць за дэмакратычныя перамены. 19 сакавіка мінулага году стала сапраўдным пераломам сітуацыі ў краіне. Таму зараз, праз год пасьля гэтай падзеі, мы заклікаем удзельнікаў Плошчы і усіх прыхільнікаў пераменаў 19 сакавіка зноў выйсьці на Кастрычніцкую плошчу і даць рэжыму сігнал – “апошні званок”. Але асноўныя сілы, безумоўна, трэба рыхтаваць да 25 сакавіка – сьвятога дня для кожнага сьвядомага беларуса.

Лічу, што зьмены ў грамадзтве, за якія змагаецца моладзь, непазьбежныя. Мне падаецца, што сітуацыя ўсё больш будзе накаляцца і магчыма, што нам не давядзецца чакаць 2011 году... Усім трэба быць гатовымі да пераменаў.

Мы, моладзь, гатовыя сваімі рукамі рабіць перамены зараз. Актыўныя, адукаваныя і дасьведчаныя маладыя людзі гатовыя працаваць дзеля таго, каб яны самі і іхнія дзеці жылі ў дэмакратычнай краіне.

**Гутарыла Марыя САВУШКІНА.**

## Былы палітзьняволены Сяргей Скрабец стварае новы моладзевы рух

**По зьвестках Радыё Свабода, новая моладзевая структура будзе называцца Моладзевым рухам імя Кастуся Каліноўскага. Запланаваная і першая акцыя гэтага руху – мітынг у падтрымку Аляксандра Казуліна і іншых палітвязьняў. Спадар Скрабец зьбіраецца зьвярнуцца ў Менскі гарвыканкам з заявай на правядзеньне мітынгу.**

**Паводле стваральнікаў руху імя Кастуся Каліноўскага Сяргея Скрабца і Сяргея Галаганюка, колькасьць сяброў арганізацыі ў розных гарадах Беларусі зараз абагульняецца. Большасьць гэтай моладзі ўжо была далучаная да партыяў і рухаў і ўдзельнічала ў палітычных акцыях.**

**Чаму зьявілася патрэба ў новым руху і чым ён будзе адрозьнівацца ад дзейных, патлумачыў Сяргей Галаганюк:**

**– Мы хочам стварыць альтэрнатыву БРСМ. Вядома, яго можна назваць палітычным моладзевым рухам і ён, натуральна, будзе дэмакратычным. Сёньня ўсе арганізацыі трымаюцца нейкіх сваіх ідэяў. Мы б хацелі праз перамовы злучыць у нашым руху ўсе моладзевыя аб’яднаньні. Бо лебедзя, рака і шчупака ўжо надакучыла бачыць. А будучыня за моладзьдзю.**

**Паводле спадара Галаганюка, пасьля першай акцыі ў падтрымку палітзьняволеных мае адбыцца зьезд і рэгістрацыя новых каліноўцаў. Наколькі запатрабаваны цяпер новы моладзевы рух, гаворыць палітолаг Уладзімір Мацкевіч: "Сёньня ў Беларусі мы маем такі парадокс, што арганізацыі не выконваюць тых функцыяў, дзеля якіх ствараліся. Здавалася б, гэта патрабуе стварэньня новых арганізацыяў. Але ж, калі няма ідэі, як і чым яны будуць адрозьнівацца ад старых, то мы і надалей будзем пладзіць тыя ж самыя, ні на што ня здольныя арганізацыі, якія крытыкуем і сёньня. Іншая рэч, што спрабаваць трэба і, калі ёсьць добрая дэбютная ідэя, то можна імкнуцца стварыць нешта такое, што будзе кардынальным чынам адрозьнівацца ад таго, што мы маем".**

# За мужнасьць і пасьлядоўнасьць

## *Палітзьняволены былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін уганараваны прэміяй імя Юрыя Захаранкі “З адкрытым забралам”*




*Акцыі "Свабоду Казуліну!" у Беларусі не перапыняюцца.*

“За мужнасьць і пасьлядоўнасьць у барацьбе з антыдэмакратычным рэжымам”, — патлумачылі выбар лаўрэата заснавальнікі прэміі.

“Аляксандр Казулін варты ўзнагароды за 2006 год як чалавек, які кінуў выклік беларускаму рэжыму і не саступіў у сваёй барацьбе”, — сказаў падчас уручэньня прэміі праваабаронца Алег Воўчак, адзін з ініцыятараў незарэгістраванага руху “Абаронцы Айчыны”.

Гэты рух аб’ядноўвае прыхільнікаў дэмакратыі сярод былых і дзейных супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Трэці год у канцы лютага “Абаронцы Айчыны” вызначаюць ляўрэата прэміі імя Юрыя Захаранкі “З адкрытым забралам”.

Раней прэміяй ушанавалі былога дэпутата, генерала Валера Фралова і праваабаронцу Гары Паганяйлу. 22 лютага падчас уручэньня прэміі Аляксандру Казуліну Гары Паганяйла зазначыў: “Існаваньне Аляксандра Казуліна ў палітыцы шмат у чым вызначае гістарычную персьпектыву нашай Беларусі. Хачу пажадаць здароўя гэтаму мужнаму чалавеку, і каб ён хутчэй быў разам з намі”, паведаміла Радыё Свабода.

Нагадаем, былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін асуджаны на пяць з паловай гадоў зьняволеньня паводле абвінавачаньня ў арганізацыі вулічных беспарадкаў 25 сакавіка 2006 году.

За кратамі Аляксандр Казулін ужо амаль адзінаццаць месяцаў, цяпер яго трымаюць у віцебскай калоніі. Апазіцыя ў Беларусі і кіраўніцтва краінаў Еўрасаюзу патрабуюць ад беларускіх уладаў неадкладнага вызваленьня Аляксандра Казуліна. Нядаўна да гэтых патрабаваньняў далучыўся польскі Сенат.

Жонка палітыка Ірына Казуліна падзякавала ўсім аднадумцам за падтрымку. Яе дагэтуль непакоіць пытаньне пра здароўе мужа, які яшчэ не ачуняў пасьля 53-дзённай галадоўкі пратэсту: “Стала халадней, і я вельмі непакоюся, як ён там перажывае гэты час. Бо незразумела, як пасьля такой галадоўкі чалавек аднаўляе сваю энергетыку. Спадзяюся на адмыслоўцаў з Міжнароднага Чырвонага Крыжа, якія абяцалі дамагацца ад кіраўніцтва калоніі, каб ім далі магчымасьць агледзець Аляксандра Казуліна. Дагэтуль увесь ягоны медычны агляд зьвёўся да аналізу крыві”.

Адміністрацыя калоніі “Віцьба-3” падоўжыла для Аляксандра Казуліна адмысловы рэжым выхаду з галадоўкі да 1 сакавіка.

### Польскія дэпутаты патрабуюць вызваленьня беларускіх палітвязьняў

**Камісія ў замежных справах польскага Сейму ўхваліла зварот да беларускіх уладаў, у якім ад Менску патрабуецца неадкладна вызваліць палітычных вязьняў, у тым ліку і Аляксандра Казуліна. Зрабіць гэта прасіла жонка экс-кандыдата ў прэзідэнты Ірына Казуліна.**

**Сябра камісіі, старшыня парламенцкай групы салідарнасьці з Беларусьсю Роберт Тышкевіч пракаментаваў Радыё Свабода: “На маю думку, мы павінны працаваць у двух накірунках. З аднаго боку – ціснуць на беларускія ўлады, каб яны выканалі патрабаваньні Еўрасаюзу, у тым ліку і неадкладна вызвалілі палітвязьняў. А з другога боку падтрымліваць дэмакратычную апазіцыю”.**

# "Пагрозу я ўспрыняў рэальна..."

6 лютага Ігар Рынкевіч сустракаўся ў віцебскай калоніі “Віцьба-3” з Аляксандрам Казуліным. Сп.Рынкевіч зьбіраўся працягнуць даверанасьць, якую раней яму выдаў Аляксандр Казулін, але адміністрацыя калоніі адмовілася засьведчыць подпіс вязьня пад гэтым дакументам.

“Мне сказалі, што гэта нібыта парушае закон і не адпавядае дзяржаўным інтарэсам. Гэта яўнае парушэньне грамадзянскіх правоў Аляксандра Казуліна і маіх правоў як ягонага прадстаўніка. Мы гэтае рашэньне абавязкова абскардзім”, – заявіў Радыё Свабода Ігар Рынкевіч. Ён зьвярнуўся пісьмова да начальніка калоніі Віталя Агнісьцікава з просьбай патлумачыць адмову выдачы даверанасьці.

Разам з тым Ігар Рынкевіч патлумачыў, што застаецца адвакатам Аляксандра Казуліна і ўпаўнаважаны далей абараняць свайго падабароннага, а адмова даверанасьці тычыцца права прадстаўляць інтарэсы падабароннага ў зносінах з партыямі, дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі, асобнымі грамадзянамі.

Па зьвестках Радыё Рацыя,15 лютага прэзідыум Менскай абласной калегіі адвакатаў вынес сп.Рынкевічу другое за перыяд абароны Аляксандра Казуліна спагнаньне — „за парушэньне працоўнай дысцыпліны”, якое яны расцанілі як палітычны ўціск.

“У трэці раз, — адзначыў сп. Рынкевіч, — мне могуць аб’явіць вымову і пазбавіць адвакацкай ліцэнзіі”.

Ігар Рынкевіч патлумачыў таксама, чаму Казулін не зьвярнуўся ў Вярхоўны суд з просьбаю аб умоўна-датэрміновым вызваленьні: “Аляксандр Казулін лічыць, што размова можа ісьці толькі аб адмене прысуду, спыненьні справы і вызваленьні.”

28 лютага ў пераходзе менскага метро Ігару Рынкевічу пагражаў невядомы чалавек... Інцыдэнт адбыўся перад тым, як сп.Рынкевіч меўся ад’ехаць на спатканьне з кліентам.

“Мяне дагнаў чалавек прыкладна 30 гадоў, — распавёў Ігар Рынкевіч Радыё Рацыя, — у спартовым адзеньні і вязанай шапачцы да вачэй. Гэты чалавек сказаў: „Адвакат, сёньня ты да свайго казла не даедзеш”. Пасьля гэтага малады чалавек зьнік у пераходзе. Я выйшаў да машыны, пакінуў там партфель з дакументамі, і мы з Уладзімірам Казуліным паспрабавалі адшукаць гэтага чалавека. Аднак гэта ў нас не атрымалася. Кантралёр станцыі метро дазволіла мне прайсьці на платформу, але цягнік са станцыі метро ўжо адпраўляўся. Тым ня менш, кантралёр паведаміла нам, што падобныя па апісаньні людзі праходзілі на станцыю з прад’яўленьнем службовых пасьведчаньняў супрацоўнікаў праваахоўных органаў”.

Сп.Рынкевіч заявіў аб інцыдэнце міліцыянтам, якія дзяжурылі ў метро: “Гэтую пагрозу я ўспрыняў рэальна, бо нам трэба было яшчэ ехаць 300 кіламетраў. Таксама я выказаў згоду пасьля прыезду ад свайго падабароннага напісаць больш разгорнутае тлумачэньне па факце пагрозаў”.

У Ігара Рынкевіча няма пэўнасьці, каму належалі гэткія пагрозы. “Каму можа быць выгадна, — сказаў ён, — каб адвакат не даехаў да свайго падабароннага? Або крымінальным структурам, або тым, хто з гэтымі структурамі змагаецца. Сёньня на спатканьні з Казуліным я высьветлю, ці мае ён якія-небудзь канфлікты з астатнімі зьняволенымі. Тады кола тых, каму гэта можа быць выгадна, звузіцца”.

# Адмова цалкам палітычная

***Палітзьняволенаму Паўлу Севярынцу адмовілі ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні***

“Павел Севярынец ня варты ўмоўна-датэрміновага вызваленьня, паколькі не пакаяўся ў злачынстве”, – так вырашыла камісія Наваполацкай сьпецкамендатуры, якая 20 лютага разгледзела справу асуджанага да абмежаваньня волі Паўла Севярынца.

Нагадаем, што з двух гадоў “хіміі” Севярынец адбыў паўтара, ня меў спагнаньняў за парушэньні дысцыпліны і паводле закону мог разьлічваць на ўмоўна-датэрміновае вызваленьне. Але камісія вырашыла, што Павел Севярынец ня стаў на шлях выпраўленьня.

“Мяне выклікалі на камісію і прапанавалі пакаяцца, але я адмовіўся”, — распавёў Павел Севярынец ужо дарогай у вёску Малое Сітна, дзе яму давядзецца адбыць яшчэ шэсьць месяцаў.

Павел Севярынец сказаў, што ў размовах з міліцыянтамі паставіў ім свае ўмовы: “Я адказаў, што гэтае пытаньне — ці раскайваецеся вы ў злачынстве? — мы зададзім кожнаму супрацоўніку міліцыі, які парушаў закон у час дыктатуры”.

Пытаньне пра ўмоўна-датэрміновае вызваленьне Паўла Севярынца разглядалася ў час, калі дзейнічаюць прапановы Еўрасаюзу да беларускага рэжыму аб наладжваньні дыялогу — Еўропа гатовая ісьці насустрач пасьля вызваленьня палітвязьняў ды іншых крокаў дзеля дэмакратызацыі. Між тым сам Павел Севярынец кажа, што ніколі не чакаў ад беларускага рэжыму рэальных крокаў насустрач патрабаваньням аб’яднанай Еўропы: “Рэжым Лукашэнкі можа стаць беларускім, толькі калі пакаецца ў антыбеларускіх дзеяньнях і зробіць пэўныя крокі. Гэта перадача ўлады дэмакратам, выпраўленьне сітуацыі з беларускай мовай, высьвятленьне праўды пра зьніклых. Толькі пасьля такога пакаяньня магчымыя размовы з гэтым рэжымам, у тым ліку і з боку Еўропы”.




Паводле Паўла Севярынца, разам з ім на “хіміі” адбываюць пакараньне болей за дзьвесьце чалавек. Гэта пераважна асуджаныя за нявыплату аліментаў, хуліганства, крадзяжы. Кожныя тры месяцы склад “хімікаў” абнаўляецца амаль на палову, у тым ліку і праз умоўна-датэрміновае вызваленьне, кажа Павел Севярынец. Паводле яго, “адмова яму ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні цалкам палітычная”.

У вёсцы Малое Сітна Павел Севярынец працуе стропальшчыкам на лесанарыхтоўцы. Ён распавёў, што ў некаторыя дні даводзілася працаваць у вельмі моцны мароз: “Мінус 32 градусы было ў пачатку лютага. І цяпер, калі працуем у другую зьмену да дванаццатай ночы, бывае складана. Але, мяркую, Дашкевіч і Казулін прамянялі б гэтыя маразы на сваю турму з вялікім задавальненьнем. Ім цяпер значна цяжэй”.

У вольны ад працы час Павел Севярынец плануе пісаць артыкулы на палітычныя тэмы, а таксама працягваць працу над раманам пра беларускае жыцьцё.

У беларускіх турмах і на “хіміі” застаюцца прынамсі шэсьць зьняволеных, якіх у Беларусі і сьвеце лічаць палітвязьнямі. Гэта Аляксандр Казулін, Зьміцер Дашкевіч, Мікалай Статкевіч, Артур Фінькевіч, Кацярына Садоўская, Павел Севярынец. Назіральнікі не выключаюць, што яны выйдуць на волю пасьля амністыі, якую рыхтуюць беларускія ўлады. За апошнія тры месяцы на волю выйшлі палітычныя актывісты Цімафей Дранчук, Іван Крук, Андрэй Клімаў, Мікалай Астрэйка.

# "Ня тым займаецеся, лепш бы кароў даілі ў аграгарадках"

1 796 подпісаў жыхароў Салігорску сабралі актывісты незарэгістраванага Маладога Фронту ў падтрымку беларускай мовы ў гарадзкім грамадзкім транспарце, у мясцовых СМ. Подпісы перададзеныя ў мясцовы гарвыканкам.

Збор подпісаў быў распачаты на пачатку лютага. Арганізавалі яго сябры Салігорскае філіі незарэгістраванага Маладога Фронту. Сярод падпісантаў – Аляксандр Мілінкевіч. Моладзь зладзіла ў Салігорску некалькі пікетаў ў падтрымку беларускае мовы, праводзіла інфармацыйныя акцыі. У прыватныя і дзяржаўныя прадпрыемствы гораду, фірмы і арганізацыі былі накіраваныя звароты.

Усяго было вылучана чатыры прапановы: беларусізаваць грамадзкі транспарт, арганізаваць правядзеньне ва ўсіх навучальных установах гораду літаратурнага конкурсу "Мова маіх продкаў", зладзіць на мясцовым тэлебачаньні беларускамоўнае ток-шоў, стварыць у мясцовай афіцыйнай газеце "Салігорскі весьнік" адмысловую рубрыку, прысьвечаную гісторыі і культуры Случчыны.

У аўторак, 27 лютага, моладзевыя актывісты мелі сустрэчу з мэрам Салігорску Аляксандрам Рымашэўскім, падчас якой і былі перададзеныя подпісы. Уражаньнямі ад сустрэчы з кіраўніцтвам гораду дзеліцца актывіст салігорскага Маладога Фронту Іван Шыла: "Нашыя подпісы прынялі і зарэгістравалі, але спадзявацца на спрыяньне з боку гарадзкіх уладаў, мабыць, не выпадае". Па ягоных словах, сэнс гутаркі зьвёўся да таго, што моладзь займаецца ня тым, што яна дзейнічае ад імя "купленых амерыканцамі палітыкаў і арганізацыяў". На думку сп. Рымашэўскага, пытаньні мовы і культурна-гістарычнай спадчыны мала цікавяць месьцічаў. Ён прапанаваў моладзі заняцца сапраўднай працай – у горадзе будуецца лядовы палац, і моладзь мусіла б агітаваць салігорцаў удзельнічаць у суботніках і пералічваць сродкі на пабудову палацу.

У часе гутаркі мэра Салігорску паінфармавалі таксама пра правядзеньне серыі вясновых акцыяў. На што ён ізноў паўтарыў: "Ня тым займаецеся, лепш бы кароў даілі ў аграгарадках".

## Няпоўнагадовага – у кайданкі

***21 лютага за распаўсюд улётак быў затрыманы чатырнаццацігадовы Антон Леванеўскі, сын былога палітзьняволенага.***

**Увечары Антона Леванеўскага затрымала ахова гарадзенскага рынку “Карона”, калі хлопец раздаваў улёткі з паведамленьнем пра запланаваны ў Менску мітынг прадпрымальнікаў. Як паведаміў Валеры Леванеўскі, каб давесьці хлопца да дзяжурнай машыны, адзін з міліцыянтаў надзеў яму на руку кайданкі, якія зьнялі ў машыне. Антона спачатку даставілі ў Ленінскі райаддзел міліцыі Гародні, пратаколу затрыманьня і канфіскацыі ўлётак не складалі. Па просьбе бацькі з пастарунку хлопца адвезьлі дадому.**

**Былы палітзьняволены, лідэр прадпрымальніцкага руху Валеры Леванеўскі лічыць парушэньнем ужываньне кайданкоў у дачыненьні да непаўнагадовага. Ён паставіў пытаньне аб узбуджэньні крымінальнай справы супраць міліцыянтаў, якія дапусьцілі незаконныя дзеяньні.**

# Гэта проста зьнішчэньне малога бізнэсу...

## *Чарговая сустрэча прадпрымальнікаў з чыноўнікамі завяршылася безвынікова*

27 лютага ў Міністэрстве эканомікі адбылося чарговае паседжаньне рабочай групы па падрыхтоўцы прапановаў для вырашэньня праблемных пытаньняў дзейнасьці індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП).

Як паведаміў старшыня савету Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Пэрсьпектыва" Анатоль Шумчанка, у выніковы пратакол паседжаньня па прапанове прадпрымальнікаў-удзельнікаў рабочай групы ўнесеныя патрабаваньні аб адтэрміноўцы да 1 студзеня 2008 году новых правілаў гандлю парфумна-касьметычнымі таварамі, а таксама вырабамі з футра. Апрача таго, ІП патрабуюць адмяніць палажэньне аб найме трох асобаў з ліку сваякоў, якое ўтрымліваецца ва ўказе прэзідэнта № 760 ад 29 сьнежня 2006 году.

– Сёньня ўсе прадпрымальнікі сыходзяцца ў адным: у сваім цяперашнім выглядзе ўказ № 760 – гэта проста зьнішчэньне малога бізнэсу, – кажа Шумчанка. – На такіх умовах мы працаваць ня зможам. Урад фактычна распранае народ такімі метадамі, бо тавары вырастуць у цане, а асартымент значна скароціцца.

Пры гэтым ён зазначыў, што "сёньня рычагоў уплыву на прыняцьце рашэньняў чыноўнікамі ў ІП няма".

– Функцыі саветаў, грамадзкіх аб'яднаньняў і самой рабочай групы зьведзеныя да нуля, – заяўляе Шумчанка, – на прапановы структураў грамадзянскай супольнасьці дзяржава ніяк не рэагуе.

Лідэр "Пэрсьпектывы" прагназуе, што "надыдзе той час, калі чыноўнікаў іхні ж кіраўнік пагоніць апранаць народ, які зараз яны распранаюць".

– Народ хоча купляць добрыя, недарагія і якасныя тавары, – лічыць Шумчанка, – а завозіць іх хутка ня будзе каму.

# Мытня не аддала дабро

## *Арыштаваная маёмасьць грамадзкага аб'яднаньня "Дапамога дзецям Чарнобылю"*

Мытнікі давялі да галечы галоўнага дабрачынцу Гомельшчыны. Яны наклалі на вядучую дабрачынную структуру 330-мільённы штраф. Яшчэ ў 100 мільёнаў рублёў абыдзецца ўтылізацыя сапсаваных прадуктаў, што па віне мытнікаў так і не дайшлі да зоны. Згнілі яны на складах, арэнда якіх каштавала 50 мільёнаў. У выніку набягае каля 200 тысячаў еўра, піша сайт www.bulletinonline.org. Такіх грошай у грамадзкай арганізацыі проста няма.

"Дапамога дзецям Чарнобылю" – адно з буйнейшых у рэспубліцы міжнародных дабрачынных грамадзкіх аб'яднаньняў. З 1991 году ў пацярпелыя ад катастрофы на ЧАЭС раёны аб'яднаньне даставіла гуманітарнай дапамогі больш як на 20 мільёнаў еўра. Аздаравіла за мяжой каля 100 тысячаў дзяцей: з дзіцячых дамоў і "дамашніх", якія хварэюць на захворваньне крыві, цукровы дыябет, анкалогію, іншыя пагаршэньні здароўя. З дапамогай дабрачынцаў у абласным эндакрыналагічным дыспансеры штогод абсьледуецца каля 10 тысячаў чалавек.

Яшчэ 9 красавіка 2005 году на адрас аб'яднаньня "Дапамога дзецям Чарнобылю" прыйшоў гуманітарны груз. 433-тонавы, увезены італьянцамі, немцамі і бельгійцамі да Вялікадня пазамінулага году. Мытня вырашыла ўсё-ткі пераважыць і праверыць 100 тон грузу. Іх давялося разьмясьціць на складах часовага захоўваньня "Аблгандальсаюзу".

Крыміналу мытня, натуральна, не знайшла. Праўда, пры надглядзе растрыбушыла 50 тон імянных пасылак, якіх "імяннымі" не прызнала, расклала па найменьнях і абвясьціла ледзь ці не кантрабандай. Кіраўнік "Дапамогі" Генадзь Карэцкі неаднаразова прасіў мытню даць тлумачэньне, што такое імянная пасылка. Але так яго і не атрымаў.

Першыя імянныя пасылкі з тых ста тон дайшлі да адрасатаў праз чатыры месяцы. Сёньня на складзе яшчэ ляжыць рэшта прадуктаў – дзевяць тон, вялікую частку трэба зьнішчаць: сапсаваліся. А гэта таксама выльецца для аб'яднаньня ў ладную суму.

Мытнікі, мабыць, дрэнна сабе ўяўляюць, хто чакае гуманітарныя грузы. У мытнага начальства добрыя кватэры і машыны, іх дзеці здаровыя, сытыя і апранутыя. Не харчуюцца радыеактыўнымі прадуктамі, ня ведаюць, што такое ўмовы існаваньня ў дзіцячым доме.

А нейкае дзіця, якое нарадзілася пасьля Чарнобылю няздольным хадзіць, лішнія паўтара гады прачакала інвалідную каляску. Пакуль дзядзька-мытнік разважаў, ці не кантрабанда гэтая каляска. А хтосьці з чарнобыльскіх дзяцей недаатрымаў вітамінаў. Вопраткі. Ды проста радасьці, якую прыносяць падарункі. А цяпер і зусім не атрымае. Дзядзькам-мытнікам што да гэтага? Яны бюджэту штрафных санкцыяў на 200 тысячаў еўра прынясуць…



Фота А. Клешчука.

## Скончыць да візіту прэзідэнта

***Рэстаўратар полацкай царквы Уладзімір Ракіцкі пратэстуе супраць загаду Мінкульту...***

Больш за 15 гадоў мастак Уладзімір Ракіцкі быў навуковым кіраўніком рэстаўрацыі Спаса-Еўфрасіньнеўскай царквы XII стагодзьдзя ў Полацку. За паўтара дзесяцігодзьдзі ім адкрытыя і адрэстаўраваныя прыкладна 150 з 600 квадратных метраў фрэскавага росьпісу.

Разам са сваімі калегамі Ракіцкі вынайшаў унікальную сістэму аднаўленьня старажытных фрэсак, дзякуючы якой удаецца захоўваць і пазьнейшыя слаі жывапісу.

У часе рэстаўрацыйных работаў высьветлілася, што ў храме першасны жывапіс закрыты размалёўкамі XVI – XIX стагодзьдзяў. Праца для адкрыцьця найстаражытнейшых фрэсак вымагае шмат часу. Аднак кіраўніцтва Міністэрства культуры патрабуе хуткай рэстаўрацыі – цягам паўгоду. Заява прагучала пасьля наведваньня Полацку прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім, які паставіў задачу ўсё скончыць да візіту ў горад Аляксандра Лукашэнкі 5 чэрвеня, на Дзень Сьвятой Еўфрасіньні.

Паводле планаў Міністэрства культуры, мяркуецца не вяртацца да арыгіналу, а ўстанавіць новую срэбную раку для мошчаў, а купал храму і ўвогуле пакрыць золатам. Паводле новага афіцыйнага праекту, у сярэдзіне бажніцы зробяць пляцоўку з жалезнымі лесьвіцамі для турыстаў. На думку Уладзіміра Ракіцкага, ня мае навуковай абгрунтаванасьці і ідэя стварэньня ў царкве мазаічнай падлогі. Усё гэта не адпавядае ні таму, як выглядаў храм, ні ўвогуле традыцыям, у якіх ён ствараўся.

Гэты праект рэстаўрацыі быў зацьверджаны без навуковай архітэктурнай экспертызы і без уліку праекту рэстаўрацыі, распрацаванага Уладзімірам Ракіцкім з калегамі. Фрэскі цяпер будуць рэстаўравацца расейскімі сьпецыялістамі, якія раней на аб'екце не працавалі.

На знак пратэсту Уладзімір Ракіцкі накіраваў заяву ў Міністэрства культуры з просьбаю зьняць з яго абавязкі па рэстаўрацыі Спаса-Еўфрасіньнеўскай царквы.

# ...Добраахвотна-прымусова

Гарвыканкам запатрабаваў ад недзяржаўнай газеты "Бабруйскі кур'ер" стварыць першасную арганізацыю Беларускага рэспубліканскага таварыства ратаваньня на вадзе колькасьцю, роўнаю штатнаму складу.

Кіраўніцтва найстарэйшага гарадзкога выданьня атрымала адпаведнае распараджэньне, падпісанае новым старшынёй гарвыканкаму Дзьмітрыем Бонахавым, паведаміла прэс-служба Асамблеі НДА.

Згодна з загадам "зьверху", суполка ратавальнікаў павінна атрымаць у памяшканьні рэдакцыі юрыдычны адрас. Акрамя таго, тлумачыцца, што трэба рабіць далей навастворанай структуры грамадзкай арганізацыі. Да 1 траўня трэба зрабіць справаздачу ў аддзел ідэалогіі гарвыканкаму за афармленьне інфармацыйнага стэнду ды збор грашовых "сяброўскіх унёскаў" у памеры адной тысячы рублёў на аднаго супрацоўніка.

Паводле меркаваньня выконваючага абавязкі рэдактара "Бабруйскага кур'еру" Анатоля Санаценкі, гэта ня нейкі ўціск менавіта іх газеты. Такія ж загады атрымалі ўсе суб'екты гаспадараньня ў Бабруйску. Пра гэта сьведчыць "шапка" дакументу. Ліст раздрукаваны на кампутары, але назва прадпрыемства ўпісаная ад рукі.

"Усё, што мы можам зрабіць – часам падаваць нейкія прафілактычныя артыкулы ад імя Таварыства ратаваньня на вадзе, – кажа Санаценка. – А прымусовае стварэньне суполкі ляжыць па-за межамі закону".

Беларускае таварыства ратаваньня на вадзе паводле заканадаўства мае статус дзяржаўна-грамадзкага аб'яднаньня. Калі грамадзкая арганізацыя можа быць дзяржаўнай, дык і метад прыцягненьня туды сяброў можа быць адпаведным: добраахвотна-прымусовым.




*22 -23 лютага ў Менску адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Беларусь і "вялікая" Еўропа – праблемы і перспектывы" з удзелам многіх вядомых палітыкаў.*

# Прытрымлівацца літары і духу закону?

Ганцавіцкая раённая пракуратура вынесла папярэджаньне незалежнаму выданьню "Ганцавіцкі час". Пракурор Ганцавіцкага раёну Сяргей Замара патлумачыў Радыё Свабода, за якія парушэньні журналісты "Ганцавіцкага часу" атрымалі папярэджаньне: "Нам напісаў старшыня выбарчай камісіі пра тое, што ім былі прадстаўленыя зьвесткі, але журналісты апублікавалі крышку не такія. Вось і ўсё".

Рэдактар Пятро Гузаеўскі пракаментаваў: "Я лічу, што на ўзроўні нашай пракуратуры, якая чамусьці больш робіцца галіной выканаўчай улады, адбываецца ціск на газету, каб прыпыніць яе выхад. Чыноўнікам не падабаецца рост накладу. Яны імкнуцца зьбіць тэмп, які газета пачала набіраць. Людзі больш сталі ёй цікавіцца і менш баяцца. Гэта ўладу палохае".

Сёлета наклад "Ганцавіцкага часу" вырас на 500 асобнікаў і дасягнуў трох тысячаў, нягледзячы на тое, што газета пазбавілася магчымасьці падпіскі праз "Белпошту" і продажу ў "Белсаюздруку", у дзяржаўных і прыватных крамах. Супрацоўнікі незалежнага выданьня арганізавалі ў райцэнтры і вёсках альтэрнатыўную падпіску і дастаўку выданьня на дом.

Паводле ацэнкі Беларускай асацыяцыі журналістаў, "Ганцавіцкі час" для многіх мясцовых жыхароў стаў ледзьве не адзінай інстанцыяй, куды можна зьвярнуцца і атрымаць дапамогу ў вырашэньні нейкіх праблемаў ці рэалізаваць права на свабоду слова. Гаворыць юрыст БАЖу Андрэй Бастунец: "У абласную пракуратуру накіраваны зварот з заклікам зьвярнуць увагу на тое, што адбываецца ў Ганцавіцкім раёне. А калі абласная пракуратура не адрэагуе, то зьвернемся ў Пракуратуру Беларусі. Бо ўсё ж такі трэба прытрымлівацца ня волі кіраўнікоў выканкаму, пракурору трэба прытрымлівацца літары і духу закону".

# А прабачацца ўсё ж давядзецца

**Суд Чыгуначнага раёну Гомелю абавязаў дзяржаўную газету "Гомельская праўда" на працягу месяцу апублікаваць абвяржэньне непраўдзівых і абразьлівых зьвестак у дачыненьні старшыні Гомельскай гарадзкой арганізацыі Аб`яднанай грамадзянскай партыі Андрэя Толчына, надрукаваных у нумары "ГП" ад 16 лістапада 2006 году.**

**16 лютага судзьдзя Мікалай Крупадзёраў зацьвердзіў тэкст абвяржэньня зьвестак, выкладзеных у артыкуле "А вы, друзья, как ни садитесь...", якія і сталі нагодай судовага разьбіральніцтва аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі.**

**Як мы паведамлялі, 9 студзеня падчас першага слуханьня справы па прапанове судзьдзі бакі пагадзіліся ўрэгуляваць спрэчку. Дамовіліся, што газета надрукуе абвяржэньне, тэкст якога падрыхтуе асабіста зыскоўца.**

**Андрэй Толчын і юрыст Леанід Судаленка ў неабходны тэрмін прадаставілі рэдакцыі "Гомельскай праўды" тэкст абвяржэньня. Аднак друкаваць яго газета адмовілася.**

**Больш за тое, 15 лютага "Гомельская праўда" зьмясьціла чарговы артыкул пра актывістаў мясцовай апазіцыі – "Бег впереди паровоза, или Зачем газету позвали в суд?", у якім падрыхтаваны спадаром Толчыным тэкст абвяржэньня папярэдняй публікацыі названы "юрыдычна непісьменным".**

**У гэтым артыкуле рэдактар аддзелу грамадзка-палітычнага жыцьця "ГП" Алена Аленчанка зрабіла спробу растлумачыць, чаму Андрэй Толчын і яго жонка былі названыя бамжамі ў публікацыі "А вы, друзья, как ни садитесь...", і за гэта прынесла прабачэньне. Усе астатнія зьневажальныя выказваньні пакінула без прабачэньняў.**

**Паводле аўтаркі, чарговы артыкул напісаны таму, што на некалькіх інтэрнэт-сайтах зьявіліся паведамленьні пра судовы зыск Андрэя Толчына да рэдакцыі. "Такія выпады ў адрас газеты прымушаюць нас вярнуцца да тэмы", – гаворыцца ў новай публікацыі.**

**Нагадаем, артыкул "А вы, друзья, как ни садитесь..." быў падпісаны імем Пятра Кузьміна. На першым судовым пасяджэньні па справе Алена Аленчанка, якая прадстаўляла ў судзе газету, заявіла, што не гатовая назваць сапраўднае імя аўтара публікацыі, паведаміўшы толькі, што гэта пазаштатны аўтар.**

**"Новы артыкул – ня што іншае, як чарговая абраза, – выказаў службе маніторынгу БАЖ сваё стаўленьне Андрэй Толчын. – Але з гэтым я буду разьбірацца пасьля таго, як рэдакцыя газеты надрукуе зацьверджаны судом тэкст абвяржэньня першай публікацыі".**

# Не шукайце логікі ў дзеяньнях Міністэрства інфармацыі

***Рэдакцыя недзяржаўнага літаратурна-мастацкага і навукова-папулярнага часопісу "ARCHE. Пачатак" атрымала адразу два папярэджаньні аб парушэньні закону "Аб друку і іншых СМІ"***

Пра гэта паведаміла прэс-служба БАЖ. Мінінфармацыі палічыла парушэньнем заканадаўства тое, што рэдакцыя часопісу надрукавала ў сьнежні 2006 году пасьля трохмесячнага прыпыненьня адразу тры прапушчаныя нумары – за кастрычнік, лістапад і сьнежань.

Папярэджаньне за № 29 вынесенае заснавальніку выданьня на падставе артыкулу 16 Закону аб друку "за тое, што не было пісьмова ў месячны тэрмін паведамлена ў Міністэрства інфармацыі аб зьмяненьні перыядычнасьці выхаду часопісу ARCHE (па ўмовах рэгістрацыі штомесячнік, але ў сьнежні 2006 г. былі выпушчаныя тры нумары – №10-12) для ўнясеньня адпаведнага зьмяненьня ў пасьведчаньне аб рэгістрацыі выданьня, што зьяўляецца парушэньнем артыкулу 11 "Закону Рэспублікі Беларусь аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі".

Папярэджаньне № 30 выносіцца рэдакцыі часопісу за парушэньне артыкулу 16 Закону аб друку. "Па ўмовах рэгістрацыі "ARCHE" ёсьць штомесячным перыядычным выданьнем. Аднак у парушэньне ўмоваў яго рэгістрацыі рэдакцыя на працягу сьнежня 2006 г. выпусьціла тры нумары часопісу (10-12) без паведамленьня ва ўстаноўленым парадку Міністэрства інфармацыі аб зьмене перыядычнасьці выпуску выданьня. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь папярэджвае рэдакцыю часопісу аб недапушчальнасьці парушэньня арт. 10 і 11 Закону РБ аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі", – паведамляецца на сайце "Нашай Нівы".

Дакументы датаваныя 12 лютага і падпісаныя першым намесьнікам міністра інфармацыі Ліліяй Ананіч. Зараз выхад часопісу можа быць ізноў прыпынены.

Па словах Андрэя Бастунца, намесьніка старшыні БАЖ, "па такой логіцы Мінінфармацыі магло вынесьці гэтае папярэджаньне часопісу адразу як прыпыніла яго дзейнасьць на тры месяцы".

"Я раіў бы шукаць карані гэтых папярэджаньняў у зьмесьце апошніх нумароў "ARCHE", а не ў датах іх выхаду", – выказаў сваё меркаваньне галоўны рэдактар часопісу "ARCHE. Пачатак" Валеры Булгакаў. Паводле ягоных словаў, рэдакцыя была вымушаная выдаць некалькі нумароў цягам аднаго месяцу, каб выканаць абавязкі перад падпісчыкамі, а таксама захаваць дамову на распаўсюд праз "Белпошту".

Нагадаем, 19 верасьня 2006 г. Мінінфармацыі вынесла часопісу "ARCHE" папярэджаньне за парушэньне артыкулу №11 Закону аб друку (зьмена тэматыкі (сьпецыялізацыі) выданьня) і прыпыніла выхад часопісу на тры месяцы.

Тады ў віну ставілася, што, апублікаваўшы матэрыялы грамадзка-палітычнага характару, часопіс зьмяніў сьпецыялізацыю і не паведаміў аб гэтым у Мінінфармацыі (паводле заканадаўства) для ўнясеньня адпаведнага зьмяненьня ў рэгістрацыйнае пасьведчаньне.

# Па "ўласным" жаданьні...

З Інстытуту гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук звольнены вядомы дасьледчык, кандыдат гістарычных навук Яўген Анішчанка. Паводле словаў вучонага сакратара інстытуту Марата Жылінскага, да Анішчанкі было шмат прэтэнзіяў, "атэстацыйная камісія, паседжаньне якой адбылося 19 лютага, прызнала, што Яўген Анішчанка не адпавядае пасадзе старшага навуковага супрацоўніка інстытуту. Наступным днём ён падаў заяву аб звальненьні па ўласным жаданьні", – сказаў Марат Жылінскі.

Сам Анішчанка сьцьвярджае, што ён падаў заяву, бо па выніках атэстацыі яму ня быў прапанаваны перавод на іншую пасаду або выпраўленьне згаданых недахопаў. Сапраўднай прычынай рашэньня атэстацыйнай камісіі Анішчанка лічыць свае дасьледаваньні, якія не адпавядаюць дзяржаўнай ідэалогіі, а таксама палітыку ліквідацыі рэштак акадэмічных свабодаў, якую праводзіць дырэктар інстытуту Аляксандр Каваленя.

Я.Анішчанка больш як 20 гадоў працаваў у Інстытуце гісторыі і займаўся дасьледаваньнем перыяду падзелаў Рэчы Паспалітай. У сваіх працах вучоны даказаў, што асноўную адказнасьць за гэта нясуць Расейская імперыя і рускі царызм. У 2004 годзе Вышэйшая атэстацыйная камісія адхіліла яго доктарскую дысертацыю па дадзенай тэме, палічыўшы высновы навукоўца бяздоказнымі. Яўген Анішчанка – аўтар 370 публікацыяў, у тым ліку 13 кніг.

Раней з Інстытуту гісторыі былі звольненыя вядомыя навукоўцы Ніна Стужынская, Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў і Сяргей Тарасаў.

# "Гэта не ад нас залежыць"

***Дзяржава абмяжоўвае правы чытачоў: бібліятэкі ня могуць выпісваць недзяржаўную прэсу***

Недзяржаўную рэгіянальную газету "Витебский курьер М" абласная бібліятэка ня можа выпісваць пры ўсім жаданьні на тое, – вынікае з афіцыйнага ліста начальніка ўпраўленьня культуры Віцебскага аблвыканкаму Мікалая Пашынскага, які атрымаў на гэтым тыдні сябра праваабарончай арганізацыі "Беларускі Хельсінскі камітэт" Павел Левінаў.

Як распавёў прэс-службе БАЖ спадар Левінаў, да яго, як да прадстаўніка БХК у Віцебскай вобласьці, пачалі зьвяртацца віцябляне са скаргамі, што ў чытальных залах бібліятэкаў гораду немагчыма пагартаць газету "Витебский курьер". Паводле гараджанаў, гэта парушае іх грамадзянскія правы на атрыманьне інфармацыі.

"Я наведаўся ў абласную бібліятэку і ўпэўніўся, што газеты сапраўды няма ў чытальнай зале. На маё пытаньне, чаму не выпісваюць гарадзкую газету "Витебский курьер", супрацоўніцы адказалі: "На вялікі жаль, гэта не ад нас залежыць, а газету сапраўды вельмі часта просяць наведвальнікі", – расказаў Павел Левінаў. – Я зрабіў запіс у кнізе водгукаў, дзе папрасіў улічыць пажаданьні чытачоў і мець у бібліятэцы таксама падшыўку "Витебского курьера".

Кіраўніцтва Віцебскай абласной бібліятэкі пісьмова адказала, што гэтае пытаньне не ў яго кампетэнцыі, і прапанавала праваабаронцы зьвярнуцца ва ўпраўленьне культуры аблвыканкаму.

"Бібліятэка пры ўсім жаданьні ня мае магчымасьці выпісваць усе перыядычныя выданьні, якія друкуюцца ў рэспубліцы і бліжэйшым замежжы", – заявіў у сваім адказе кіраўнік упраўленьня культуры Віцебскага аблвыканкаму. І далей паведаміў, што, "нягледзячы на абмежаванасьць бюджэтных сродкаў", абласная бібліятэка выпісала 713 выданьняў.

"Пастараюся знайсьці грашовыя сродкі, каб падпісаць абласную бібліятэку на "Витебский курьер", – расказаў Павел Левінаў. Ён выказаў намер зьвярнуцца ва ўпраўленьне культуры з прапановай аказаць ім такую дапамогу.

У лісьце начальніка ўпраўленьня культуры адзначаецца, што бібліятэка, робячы падпіску, арыентуецца на выданьні, якія выходзяць вялікімі накладамі. На яго думку, гэта значыць – карыстаюцца попытам у чытачоў.

"Наклад газеты "Витебский курьер М" складае 1500 асобнікаў, любы жадаючы мае магчымасьць падпісацца ў прыватным парадку на дадзенае выданьне альбо ж азнаёміцца ў рэдакцыі з публікацыямі газеты", – сьцьвярджае Мікалай Пашынскі.

Нагадаем, што з пачатку 2006 году "Витебский курьер" немагчыма выпісаць праз каталог "Белпошты". Напрыканцы 2005 году дзяржаўнае паштовае прадпрыемства-манапаліст адмовілася распаўсюджваць газету і выключыла разам з шэрагам іншых недзяржаўных выданьняў з падпіснога каталогу. "Белсаюздрук" у гэты ж час адмовіўся прадаваць газету ў сваіх кіёсках.

Газета страціла шляхі распаўсюду, і гэтая акалічнасьць вымусіла рэдакцыю "Витебского курьера" зьнізіць наклад. А ў адрозьненьні ад афіцыйных выданьняў "ВК" не атрымлівае фінансавай падтрымкі ад дзяржавы.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.